**Фаіна Малюжэнец**



# V ЯРКІЯ КАРЦІНКІ ШЧОРСАЎСКІХ ЧЫТАННЯЎ

**Метадыст Навагрудскай раённай бібліятэкі**



10–11 чэрвеня 2021 г. у Навагрудку і аг. Шчорсы Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці адбыліся юбілейныя V Шчорсаўскія чытанні. Арганізатарамі канферэнцыі выступілі: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, аддзел культуры Навагрудскага раённага выканаўчага камітэта і Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага. Гасцей прымала Навагрудская раённая бібліятэка. У гэтым адукацыйна-навуковым праекце прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, рэлігійных канфесій, супрацоўнікі музеяў, навукоўцы, гісторыкі, краязнаўцы і, вядома, бібліятэкары. Усе яны былі з розных куткоў Беларусі і ўстаноў. Прысутнічалі спецыялісты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, далучаліся анлайн бібліятэкары Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Гродзенскай і Гомельскай абласных бібліятэк, а таксама кіраўнікі і бібліятэкары раённых (гарадскіх цэнтральных) бібліятэк Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.

Навагрудчына прыцягвае да сябе навукоўцаў, гісторыкаў, краязнаўцаў і ўвогуле простых людзей. Адны толькі сусветна вядомыя імёны Адама Міцкевіча і Іахіма Літавора Храптовіча чаго каштуюць! І абодва звязаны з кнігай. Адзін праз паэзію, другі – праз бібліятэку. Менавіта тут, у Шчорсаўскім маёнтку, на працягу другой паловы XVIII – першай паловы XIX ст. была сабрана вядомая бібліятэка Яўхіма Храптовіча. Напэўна гэты факт стаў апошняй вызначальнай кропкай на карысць Шчорсаўскіх чытанняў. Сапраўды, лепшага месца масавых зносін па гістарычных пытаннях, чым Шчорсы, не знайсці.

І вось у 2012 г. г. Навагрудак і аг. Шчорсы былі абраны месцам правядзення навуковай канферэнцыі, якая атрымала назву Шчорсаўскія чытанні. З таго часу гэтае мерапрыемтва праводзіцца адзін раз у два гады, адпаведна ў 2014, 2016, 2018 гг. V Шчорсаўскія чытанні меліся адбыцца ў мінулым годзе, але з-за пандэміі каронавірусу былі адкладзены на год. Менавіта таму гэты навуковы форум сабраўся сёлета – не праз два, а праз тры гады. Госці ехалі сюды праз сотні кіламетраў, нягледзячы на пагрозу хваробы, якая за год пакуль што не знікла, каб пачарпнуць веды, набыць для сябе нейкі практычны вопыт па пытаннях культуры, бібліятэказнаўства, кнігазнаўства, гісторыі. У гэтым сэнсе наша гістарычная Наваградская, і ў прыватнасці Шчорсаўская зямля, у чарговы раз дзялілася ўсім, што мае.




Праграма чытанняў была насычанай. Працавалі дзве секцыі. Першая «Актуальныя пытанні бібліятэчнай справы: стратэгічныя кірункі дзейнасці» (яна засядала ў Навагрудскай раённай бібліятэцы), на другой ішла размова пра «Кніжныя помнікі Гродзеншчыны» (працавала ў Доме-музеі Адама Міцкевіча).

На першай секцыі былі заслуханы даклады бібліятэкараў, якія адлюстроўвалі стан і перспектывы работы публічных бібліятэк Гродзеншчыны (М. Ігнатовіч, дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага); актуальныя пытанні бібліятэчнай і краязнаўчай справы (І. Царук, дырэктар Навагрудскай раённай бібліятэкі). Госці дзяліліся вопытам работы бібліятэчных устаноў Гомельскай вобласці ў сучасных умовах (М. Рафеева, дырэктар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У.І. Леніна), прыярытэтнымі кірункамі ў рабоце публічных бібліятэк Барысаўскага раёна (А. Капыток, дырэктар Барысаўскай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева) і сеткавым інтэрнэт-праектам па папулярызацыі ўстаноў бібліятэчнага тыпу сярод карыстальнікаў Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці (В. Бусел, дырэктар Светлагорскай раённай бібліятэкі).

У выступленнях навукоўцаў, краязнаўцаў і святароў, што прымалі ўдзел у рабоце другой секцыі, гучала тэма даследаванняў беларускіх кніжных помнікаў, таксама ішла размова пра культурна-пазнавальны і рэлігійны турызм. Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі А. Суша распавёў пра Шчорсаўскую бібліятэку Храптовічаў і шляхі яе вяртання на радзіму. З вялікай цікавасцю была ўспрынята інфармацыя Т. Сапегі, загадчыка сектара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, пра кнігі, выдадзеныя ў Навагрудку ў першай палове XX ст. Змястоўнымі былі даклады пра кніжныя помнікі Рэспублікі Беларусь, Т. Карнілавай, супрацоўніка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, і пра рэдкія выданні Гродзеншчыны, С. Паўлавіцкай і А. Пагоскай, супрацоўнікаў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.

По ініцыятыве арганізатараў форуму ўвазе ўдзельнікаў была прадстаўлена рука-



песная спадчына татарынаў, якую прадставіла Р. Аляксандровіч, супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі. Гэты стэнд размяшчаўся ў Доме-музеі Адама Міцкевіча побач з рэлігійнымі скарбамі цэркваў Навагрудскай епархіі і шматлікімі выданнямі твораў Адама Міцкевіча ў перакладзе на розныя мовы. На стэндзе былі прадстаўлены – мугір, Кур'ан і хамаілы, а таксама грунтоўнае даследаванне духоўнай рукапіснай спадчыны татарынаў М. Тарэлкі «Тафсіры, кітабы і хамаілы: з прыватных кнігазбораў Беларусі». У кожнага з экспанатаў свая гісторыя. Мугір – як помнік народнага мастацтва. Хамаілы разам з Кур'анамм, адносяцца да найбольш распаўсюджанных рукапісаў. Кожны з іх мае сваю адметнасць і разам яны складаюць суцэльную карціну духоўнага жыцця татарынаў-мусульман. Каштоўныя як самыя рукапісы, так і асобныя лісточкі-ўкладкі. А ў адзін з хамаілаў укладзены фотаздымак для дакумента – імя ўладальніцы пакуль невядомае.

Удзельнікі другой секцыі былі вельмі ўражаны выступленнем ксяндза Віталія Цыбульскага, настаяцеля парафіі касцёла святога Казіміра ў аг. Уселюб, аднаго з самых старажытных касцёлаў Беларусі. Ксёндз робіць вялікія рэчы для евангелізацыі насельніцтва не толькі ў межах сваёй парафіі, але і праз арганізацыю рэлігійнага турызму. Якраз у гэтым і ёсць яго крэатыўнасць, дарэчы, гэтую ягоную рысу ўбачыла і так назвала мадэратар другой секцыі. Святар мае масу прапаноў як для аднасяльчан, так і для пілігрымаў. Пры касцёле арганізаваны і на належным узроўні забяспечаны рэлігійны і пазнавальны адпачынак, таму зараз сюды з цікаўнасцю і задавальненнем едуць вандраўнікі з розных куткоў Беларуі, і не толькі. Ксёндз Віталій мае мару – «стварыць ва Уселюбе духоўна-турыстычны комплекс, каб людзі з усяго свету даведаліся аб нашым выдатным месцы, касцёле, святынях і гісторыі тутэйшых месц». Касцёл знаходзіцца у 13 км ад Навагрудка ў Іўеўскім напрамку, і ксёндз Віталій запрасіў прысутных наведаць яго парафію. Да месца будзе сказаць, што 21 жніўня 2021 г. тут адбыўся фестываль-рэкалекцыі «Novafest».

Ёсць яшчэ адна рэлігійная славутасць на Навагрудчыне, якая заслугоўвае ўвагі і якую наведалі ўдзельнікі Шчорсаўскіх чытанняў – гэта Свята-Елісееўскі Лаўрышаўскі мужчынскі манастыр, які ў XIII ст. быў цэнтрам летапісання ў Беларусі. Каля 1329 г. тут было напісана рукапіснае Евангелле – помнік беларускага кнігапісання, якое цяпер захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве. У XVI ст. пры манастыры дзейнічала школа, мелася багатая бібліятэка. Манастыр знаходзіцца па-суседстве са Шчорсамі, таму, зразумела, удзельнікі чытанняў наведалі яго. Так званую экскурсію па святыні правёў іераманах Аляксей Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра.

Арганізатары Шчорсаўскіх чытанняў не маглі прамінуць яшчэ адзін аб'ект у гістарычна знакамітых Шчорсах – гэта сядзіба Іахіма Літавора Храптовіча. Калісьці гэта быў палацавы комплекс з багатай бібліятэкай і карціннай галерэяй, вялікім паркам, каскаднымі сажалкамі і гаспадарчым дваром, які з'яўляўся сапраўдным агракамбінатам. На працягу некалькіх стагоддзяў маёнтак належаў роду Храптовічаў, але асабліва праславіў магнацкую рэзідэнцыю Іахім Літавор Храптовіч, апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага. Сёння ад былой велічы магнацкай рэзідэнцыі Храптовічаў мала што засталося. У гады Першай сусветнай вайны палац згарэў і не быў адноўлены. Маёнтак разам з паркам пастуова прыйшоў у занядпад. Захаваліся толькі фрагменты сядзібы: двухпавярховы дом упраўляючага, будынак, дзе жыла прыслуга, вяндлярня, рэшткі гаспадарчага двара і стайняў, напаўразбураныя падвалы на месцы палаца. Рэстаўрацыя палацава-паркавага комплексу дагэтуль не праводзілася, але пэўныя меры па захаванні гістарычна-культурнай спадчыны ўсё ж прымаюцца. Акрамя таго, у 2017 г. адкрыты дабрачынны фонд «Шчорсы і Храптовічы», які вядзе актыўную валанцёрскую дзейнасць. Вось усе гэтыя аб'екты і наведалі ўдзельнікі навуковай канферэнцыі. А яшчэ яны зазірнулі ў аграсядзібу «Шчорсы», якая зараз знаходзіцца на тэрыторыі парку былога маёнтка Храптовічаў, сёння тут можна спыніцца для адпачынку невялікай групе падарожнікаў. Супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі тут асабліва зацікавіліся кніжнымі экспанатамі, якія дэманструюцца ў сядзібе, нават паспрачаліся наконт дакладнасці храптовіцкага экслібрыса на адной з кніг.

У Навагрудскай раённай бібліятэцы для ўдзельнікаў чытанняў былі арганізаваны адкрытыя прагляды літаратуры «Добрыя кнігі яднаюць нас», «Наваградскія цікавосткі», «Кніга – эліксір здароўя». Шчорсаўская сельская бібліятэка прадставіла адкрыты прагляд літаратуры «Шчорсаўскія скарбы» і інтэрактыўную пляцоўку «Нёманскія прасторы – Навагрудскі край». У Шчорсаўскім сельскім доме культуры ўвагу публікі прыцягнула літаратурна-музычная кампазіцыя «Гіста-

рычныя постаці мінулага» і шматлікія выставы, на якіх былі прадстаўлены кнігі, лялькі, вайняныя вырабы, аптэчны посуд і шмат іншае. Сярод адрасоў Шчорсаўскіх чытанняў таксама Дом-музей Адама Міцкевіча.

Цікавай атрымалася экскурсія па Навагрудскай раённай бібліятэцы, падчас якой адбылося знаёмства гасцей з міні-музеем макетаў «Страчаная спадчына» (арганізаваны ў 2017 г.) і рэтра-фотаатэлье, якое, між іншым, вельмі ўразіла ўдзельнікаў мерапрыемства.



Рэтра-фотаатэлье пры Навагрудскай раённай бібліятэцы адчынена 7 студзеня 2021 г. на грант Прэзідэнта 2020 г. у галіне навукі, адукацыі, аховы здароўя і культуры. У гэтых мэтах адзін з пакояў міні-музея быў абсталяваны і стылізаваны пад рэтра-фотаатэлье 20–30-х гг. XX ст. З інтэр’еру тут – крэсла, этажэрка, падстаўка пад вазоны, сафа, на сценах – фотаздымкі старога Навагрудка. З аксесуараў – клатч для лэдзі, каўнерыкі, капялюшыкі, веера і вуалеткі, вязаныя сурвэткі, карункавы парасон і інш. З адзення, якое, дарэчы, цалкам адпавядае першай палове XX ст., – пашыты на заказ касцюм гараджанкі і форма гімназісткі («Матроска» – менавіта так гэты касцюм называлі на Навагрудчыне). Але галоўнае – фотабокс з імгненным друкаваным фота [1, с. 9].

Праз некалькі месяцаў на базе рэтра-фотаатэлье была створана анімацыйна-забаўляльная інтэрактыўная праграма «Вандроўка з навагрудскай гараджанкай», якая шматлікімі гісторыямі з жыцця гараджан пачынаецца ў міні-музеі «Страчаная спадчына», потым бібліятэкар суправаджае групу на плошчу горада і распавядае пра будынкі, вуліцы, скверы. У пэўны момант перад удзельнікамі з’яўляецца гараджанін, апрануты па модзе пачатку XX ст. і прапаноўвае паўдзельнічаць у віктарыне «Што было ў гэтым будынку. У завяршэнні праграмы з дапамогай фотабокса прапануецца зрабіць адзін агульны фотаздымак.

Вось у гэтую вандроўку на завяршэнне першага дня і адправіліся ўдзельнікі Шчорсаўскіх чытанняў, у ходзе якога адбылося іх запамінальнае знаёмства з жыццём даваеннага Навагрудка і яго гараджанамі, захаванымі архітэктурнымі аб’ектамі гістарычнага цэнтра горада, яшчэ яны пабылі на Навагрудскім замку, падняліся на курган Міцкевіча, а таксама паўдзельнічалі ў інтэрактыўных заданнях.

Звычайна, пасля таго, як што-небудзь ужо зроблена, як здзейснілася нейкая падзея, людзі абменьваюцца сваімі думкамі і ўражаннямі. Па гэтых меркаваннях можна з высокай доляй праўды ацаніць значнасць таго ці іншага мерапрыемства. Тым больш, калі інфармацыя чэрпаецца з сацыяльных сетак, дзе чалавек незалежны ад кіраўніцтва, арганізатараў і гаспадароў мерапрыемства. Прыводжу вам, паважаныя чытачы, вытрымкі з каментарыяў наконт V Шчорсаўскіх чытанняў з «Facebook»:

*Алена Капыток:* «Выдатныя і насычаныя два дні ў Навагрудку падарылі і радасць ад сустрэчы з калегамі, і выдатныя ўражанні ад старажытнага горада са сваёй гісторыяй. Дзякую ад усёй душы за магчымасць расказаць пра досвед праектнай дзейнасці Барысаўскай бібліятэкі для ўдзельнікаў V Шчорсаўскіх чытанняў… і за гасціннасць».

*Марына Рафеева:* «Вялікі дзякуй... за вашу гасціннасць і шчодрасць душы і сэрца!».

*Алесь Суша:* «Нізкі паклон за арганізацыю і правядзенне чытанняў, але найперш – за цеплыню і спагаду, з якой вы сустрэлі нас».

ЛІТАРАТУРА

1. **Царук, І.** Рэтра-фотаатэлье ў бібліятэцы / Ірына Царук // Бібліятэчны свет. – 2021. – № 4. – С. 6–9.

Summary

The article summarizes the results of the V Shchorsy Readings.